**Р Э Ц Э Н З І І**

УДК 811.161.3

**Б. А. Крук**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дэкан факультэта дашкольнай і пачатковай адукацыі,
УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна”

## ДАПАМОЖНІК ПА ЛІНГВІСТЫЧНЫМ АНАЛІЗЕ: ДАСКАНАЛА І НАВУКОВА

*Солахаў А. В. Сучасная беларуская літаратурная мова: віды лінгвістычнага аналізу / А. В. Солахаў. – Мінск : Народная асвета, 2016. – 415 с.*




Лінгвістычны аналіз як аб’ект методыкі мовы нельга назваць малавывучаным, бо методыцы правядзення розных відаў лінгвістычнага аналізу ўдзелена ўжо дастаткова ўвагі як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе. Тым не менш і ў апошнія 2–3 дзесяцігоддзі гэтае пытанне “лідзіруе” сярод аб’ектаў навуковых і метадычных назіранняў вучоных-лінгвістаў і настаўнікаў-практыкаў. Яму прысвяцілі свае працы В. Д. Старычонак, В. А. Ляшчынская, І. Я. Лепешаў, В. І. Рагаўцоў, У. Ц. Піскун, С. Я. Кечык і многія іншыя. Аднак у пераважнай большасці – гэта апісанні асобных відаў моўнага разбору. Дапаможнік А. В. Солахава “Сучасная беларуская літаратурная мова: віды лінгвістычнага аналізу” – гэта найбольш поўнае і комплекснае апісанне методыкі лінгвістычнага аналізу “на розных узроўнях мовы: лексічным, фанетычным, арфаграфічным, графічным, марфемным, словаўтваральным, марфалагічным, сінтаксічным, пунктуацыйным” (с. 3).

Раздзелы дапаможніка “Лексічны аналіз”, “Аналіз фразеалагізмаў”, “Словаўтваральны аналіз” (сс. 5–102) пабудаваны аднатыпна. Спачатку аўтар дае апісанне пэўнага віду аналізу, затым прыводзіць парадак, а ніжэй падае ўзоры аналізу і змяшчае даведачны матэрыял, дзе ў сціслай форме даюцца розныя тэарэтычныя палажэнні, асвятляюцца пытанні, якія могуць выклікаць цяжкасці ў студэнтаў і настаўнікаў. У гэтай частцы дапаможніка аўтар асвятляе і найбольш складаныя лінгвістычныя пытанні, а таксама пытанні, якія ў дапаможніках па беларускай мове распрацаваны не ў поўнай меры, і ўказвае на крыніцы, дзе можна знайсці адказ на тое ці іншае пытанне. Аўтар дапаможніка прапануе ў кожным раздзеле матэрыялы для самастойнай працы і самакантролю. Гэта і тэарэтычныя пытанні, і практычныя матэрыялы, да якіх падаюцца адказы. Выканаўшы заданні самастойна, студэнт зможа праверыць сябе, звярнуўшыся да прапанаваных аўтарам дапаможніка адказаў (сс. 321–409). Адразу трэба заўважыць, што некаторыя адказы дадзены з аргументаванымі ўдакладненнямі і тлумачэннямі лінгвістычных з’яў. Яны ў пэўнай меры пашыраюць тэарэтычныя тлумачэнні, змешчаныя ў раздзелах “Даведачны матэрыял” дапаможніка.

Аўтар рэцэнзуемага дапаможніка надзвычай уважліва паставіўся да адбору практычных матэрыялаў, асабліва да раздзелаў “Марфалагічны аналіз” і “Сінтаксічны аналіз”. У дапаможніку выкарыстаны прыклады з твораў мастацкай літаратуры (Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Крапівы, М. Танка, П. Броўкі, П. Панчанкі і многіх сучасных аўтараў). Шырока пададзены ў дапаможніку ў якасці прыкладаў сказы-апісанні, якія перадаюць прыгажосць, непаўторнасць прыроды Беларусі ў розныя поры года.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Значная частка дапаможніка прысвечана марфалагічнаму аналізу (сс. 109–235). Аўтар дае парадак марфалагічнага разбору пэўнай часціны мовы (назоўніка, прыметніка, лічэбніка і інш.), прыводзіць некалькі ўзораў аналізу (звычайна два-тры, радзей – чатыры), забяспечвае студэнта багатым даведачным матэрыялам, часам закранаючы і гісторыю, і сучасны стан распрацаванасці пытання. Метадычную каштоўнасць, на наш погляд, мае дапаможнік і таму, што ў ім пададзены ўзоры марфалагічнага аналізу безасабова-прэдыкатыўных слоў, звязкі, мадальных слоў, гукаперайманняў – лексіка-граматычных класаў, якія адсутнічаюць у папярэдніх выданнях.

Методыка сінтаксічнага аналізу словазлучэння, простага і складанага сказаў, сінтаксічны аналіз сказа з простай мовай і аналіз складанага сінтаксічнага цэлага (сс. 236–310) дадзены аўтарам у традыцыйнай манеры. Аднак гэтую частку дапаможніка адрознівае ад папярэдніх тое, што ў ёй шырока пададзены сказы і невялікія тэксты прыродаапісальнага характару, што дазволіць выкладчыкам звярнуць увагу студэнтаў на прыгажосць і адметнасць краявідаў Беларусі.

У дапаможніку праз розныя віды лінгвістычнага аналізу дадзена разуменне аўтарам мовы як сістэмы, што абавязкова павінна ўлічвацца ў кантэксце сучасных поглядаў на тэорыю і практыку вывучэння мовы. А. В. Солахаў звяртае ўвагу і на ўжыванне ў мастацкай літаратуры ненарматыўных адзінак, што дазволіць пазбегнуць шматлікіх памылак.

Трэба адзначыць і знешні выгляд дапаможніка: ён аформлены проста, але з густам.

Відавочна, што айчынная метадычная і лінгвістычная навука, студэнты-філолагі і настаўнікі-практыкі атрымалі грунтоўны дапаможнік, карысны тым, што арыентаваны на сістэматызацыю ведаў, на развіццё і ўдасканаленне лінгвістычнага мыслення па важнейшых раздзелах курса “Сучасная беларуская літаратурная мова”. Выданне будзе карысна абітурыентам, навучэнцам педагагічных каледжаў, студэнтам-філолагам і настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, якія працуюць ва ўстановах адукацыі рознага тыпу.

МГПУ им. И.П.Шамякина